Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

www.gazeta.bsu.by

УНІВЕРСІТЭТ

Пераможца V Нацыянальнага конкурсу друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыі «Найлепшая шматтыражная газета»

2 ліпеня 2015 года, № 12 (2136)

УРАЧЫСТАСЦІ

Баль выпускнікоў прайшоў 25 чэрвеня ў БДУ

На гэту імпрэзу былі запрошаны каля 600 чалавек. Усяго сёлета дыплом БДУ атрымалі звыш 4,5 тыс. маладых людзей. З іх больш за 3 тыс. скончылі дзённае аддзяленне і каля 1,3 тыс. – завочнае.

З віншавальным словам выступіў рэктар БДУ акадэмік Сяргей Абламейка. Асаблівую святочнасць вядучаму ўніверсітэту Беларусі надаў парад дэканаў у мантыях і канфедэратках.

Ва ўрачыстай атмасферы самым годным выпускнікам рэктар уручыў ганаровыя дыпломы і памятныя падарункі за адмысловыя заслугі ў спартыўным, навуковым, культурным і грамадскім жыцці ўніверсітэта. У ліку ўзнагароджаных – 23 уладальнікі звання «Студэнцкі лідар» і 20 юнакоў і дзяўчат, прызнаных «Найлепшымі выпускнікамі БДУ».

Акрамя таго, яшчэ нядаўнія студэнты далі клятву «Годна служыць прынцыпам дабра і справядлівасці на карысць чалавеку, Айчыне і сусветнай цывілізацыі; захоўваць і прымнажаць хвалебныя традыцыі альма-матар, быць узорам высакароднасці, сумленнасці і працавітасці; усе сілы, розум, імкненні накіраваць на павышэнне аўтарытэту БДУ і з гонарам насіць званне выпускніка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».

Эстафету святочнай праграмы прынялі артысты беларускай эстрады. На сцэне актавай залы Ліцэя БДУ выпускнікоў павіншавалі Юзары і Аляксей Грос.

Арганізатар мерапрыемства – упраўленне па справах культуры БДУ – здзівіў выпускнікоў і гасцей разнастайнасцю танцавальных стыляў і кірункаў, прыгажосцю і арыгінальнасцю строяў і зрабіў гэты дзень незабыўным у жыцці кожнага дыпламанта.

ВЫХАВАНЦЫ БДУ ДЛЯ 21 КРАІНЫ

А 26 чэрвеня адбыўся выпускны баль для студэнтаў – грамадзян замежных дзяржаў.

Павіншавалі выпускнікоў прарэктар па навуковай рабоце БДУ акадэмік Алег Івашкевіч і дэканы факультэтаў. На гэта студэнцкае свята былі запрошаны таксама кіраўнікі пасольстваў дзяржаў, грамадзяне якіх навучаліся ў БДУ. Сярод іх – кіраўнікі дыпламатычных місій КНР, В'етнама, Турцыі, Лівіі, Азербайджана, Туркменістана і Казахстана. Адзначым, прадстаўнікі пасольстваў заўсёды ўважліва сочаць за поспехамі сваіх суайчыннікаў.

Героямі міжнароднай і адначасова шматнацыянальнай імпрэзы

сталі звыш 470 высокакваліфікаваных спецыялістаў, якія прадстаўляюць 21 дзяржаву. Дарэчы, у мінулым годзе дыпломы атрымалі 272 студэнты з 14 краін.

Найлепшым выпускнікам за выдатную вучобу і актыўны ўдзел у грамадскім і спартыўным жыцці былі ўручаны ганаровыя граматы і фірмовыя значкі.

Ад імя бацькоў, маці адной з выпускніц, выказала шчырыя словы падзякі і падарыла нашаму прарэктару туркменскі нацыянальны строй.

Самыя папулярныя ў замежных грамадзян факультэты: эканамічны – 202 дыпломнікі, міжнародных адносін – 80, філалагічны – 74.

У БДУ прыехала моладзь па прафесійныя веды з Кітая, Туркменістана, В'етнама, Казахстана, Турцыі, Нігерыі, Азербайджана, Грузіі, Ірака, Лівіі, Узбекістана, Сірыі, Рэспублікі Карэя, Емена, Расіі, Малдовы, Венесуэлы, Эквадора, Эстоніі, Украіны, Таджыкістана, Індыі, Ірана, Арменіі.

Для гасцей і ўдзельнікаў імпрэзы была падрыхтавана святочная праграма. Яна ўключала віктарыну і розыгрышы, групавыя сэлфі ў фотазоне і танцавальны вечар.

У наш час у БДУ навучаецца больш за 2300 студэнтаў з 47 краін свету.

Ларыса ПЕТРАВЕЦ

Фота Аляксандра СНАПКА

У нумары:

МІНСК У ПЕРШЫЯ ДНІ ВАЙНЫ
З дзённіка студэнта БДУ Міколы Лобана
Стар. 2

ПРАМОЎЦА ЗА НАВУКУ
Інтэрв'ю з вядомым юрыстам Юрыем СМІРНОВЫМ пра яго працу ў БДУ і апараце ЦК КПБ
Стар. 3

УЗНАГАРОДЫ ПЕРШЫХ ЕЎРАПЕЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ
Студэнты БДУ заваявалі залаты і два бронзавыя медалі на Еўрапейскіх гульнях у Баку
Стар. 4

Весткі з рэктарата

ДЗЯРЖАЎНЫМІ ўзнагародамі ўшанаваны супрацоўнікі БДУ. Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны загадчык кафедры інфармацыйных сістэм кіравання ФПМІ *Віктар Краснапрошын*. Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны дырэктар НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі *Пётр Кучынскі*. Званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь» прысвоена загадчыку лабараторыі фізіка-хіміі палімерных матэрыялаў і прыродных арганічных злучэнняў НДІ ПФП імя А. Н. Сеўчанкі *Міхаілу Ксенафонтаву*.

* * *

ПАДЗЯКІ Прэзідэнта Беларусі абвешчаны загадчыку кафедры тэорыі і гісторыі дзяржавы і права юрыдычнага факультэта БДУ *Сяргею Калініну* за плённую навукова-педагагічную дзейнасць, а таксама пяцікурсніку Інстытута журналістыкі БДУ *Дзмітрыю Нікановічу* за выдатныя поспехі ў вучобе і ўдзел у грамадскім жыцці. Усяго ў спісе ўзнагароджаных восем выкладчыкаў і 14 студэнтаў ВНУ.

* * *

СУМЕСНЫ факультэт інфармацыйных тэхналогій адкрылі БДУ і Таджыкскі нацыянальны ўніверсітэт (ТНУ). Дамову падпісалі 12 чэрвеня ў Душанбэ Сяргей Абламейка і Махмадзюсуф Імомаў. Рыхтаваць студэнтаў будуць па спецыяльнасцях прыкладная інфарматыка, камп'ютарная бяспека, матэматыка і інфармацыйныя тэхналогіі. Два гады таджыкскія студэнты будуць навучацца ў ТНУ, а наступныя два – у БДУ, дзе і адбудзецца абарона дыпломнай працы. Пры факультэце таксама будзе працаваць падрыхтоўчае аддзяленне і падрыхтоўчыя курсы для абітурыентаў.

ДАМОВА пра ўзаемнае супрацоўніцтва падпісана паміж БДУ і Універсітэтам «Business Academy» (Нові-Сад, Сербія). Прадугледжваецца ўзаемадзеянне ў адукацыйнай, педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасці. Дакумент падпісалі рэктар БДУ Сяргей Абламейка і віцэ-прэзідэнт Савета Універсітэта «Business Academy» Марка Царыч.

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ДА 70-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

Мінск у першыя дні вайны

(з дзённіка студэнта БДУ Міколы Лобана)

22 чэрвеня – змрочная дата для Беларусі. У гэты дзень мірнае жыццё нашых гарадоў і вёсак раптоўна было парушана. Наперадзе будзе мужнае народнае супраціўленне ворагу на фронце, у партызанах, у падполлі, але першыя дні вайны для ўсёй краіны – гэта толькі прадчуванне вялікай трагедыі, усведамленне масштабаў узніклай пагрозы. Пра гэтыя дні нам сведчаць успаміны ўдзельнікаў тых падзей, аднак найбольшую цікавасць уяўляюць асабістыя дзённікі, якія фіксавалі падзеі непасрэдна ў той час і на тым месцы. Адным з такіх унікальных дакументальных помнікаў з'яўляецца ваенны дзённік **Міколы ЛОБАНА** – беларускага пісьменніка, навукоўца, педагога, удзельніка баёў на Волхаўскім фронце. Сёння гэты дзённік захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музеі літаратуры і мастацтва.

Мікола Лобан

Універсітэцкі гарадок, 1930-я гады

Запісы дзённіка тады яшчэ студэнта трэцяга курса філфака БДУ Міколы Лобана пачынаюцца непасрэдна ў першыя дні вайны, якія ён сустрэў у Мінску. Гэтая частка дзённіка ніколі не публікавалася.

22 чэрвеня 1941 года Мікола Лобан з самага ранку накіраваўся ў гарадскі парк, каб рыхтавацца да іспыту па гісторыі. Пра тое, як для яго пачалася вайна, ён напісаў наступнае: «Быў выхадны дзень. Я адшукаў ёмкае месца і размясціўся. Лес шумеў ад халоднага паўночна-ўсходняга ветру і агалошваўся песнямі моладзі. Моладзь ішла атрадамі па лесе. Сяды-тады праходзілі звеннямі чырвонаармейцы з вінтоўкамі наперавес у поўнай баявой гатоўнасці. Па загаду лейтэнанта да мяне падбег чырвонаармеец і папрасіў дакументы. Я здзіўлена паказаў яму свой пашпарт. Чырвонаармеец зверыў фотакартку з тварам і вярнуў пашпарт.

Штосці не чыталася. Я вымушаны быў пакінуць лес і ехаць назад. На трамвайным прыпынку сабралася некалькі вагонаў, і яны не рухаліся. У пярэднім вагоне я спаткаў Сазоніка. Ён мне расказаў, што быў на дапрызыўным зборы і што рабілі паход у бок парка.

Мы прайшлі некалькі прыпынкаў і затым селі на падышоўшы трамвай. Я злез каля бібліятэкі, каб убачыць каго са сваіх студэнтаў. У бібліятэцы знайшоў толькі трох чытачоў. Мяне здзівіла гэта, заўсёды тут былі запоўнены ўсе сталы і кабінеты.

На вуліцы Карла Маркса стаяла міліцыя. Загудзела сірэна, абвяшчаючы трывогу. Усе беглі па вуліцы, абмінаючы міліцыянераў, якія заганялі ў пад'езды. Так ледзь дабраўся да ўніверсітэта. На сходнях стаяла некалькі чалавек і сярод іх наш выкладчык гісторыі Шабуня з процівагазам. На лаўцы я ўбачыў Вальштэйна[1].

– Як вам гэта падабаецца? – запытаў ён мяне.

– Звычайна, – адказваю я, – патрэбна рыхтаваць насельніцтва.

– Як рыхтаваць? Вы нічога не знаеце? Вайна!

Я адчуваў сябе, як зваліўшыся з месяца. Вальштэйн расказаў мне пра прамову т. Молатава па радыё наконт пачатку вайны...»

Ужо на наступны дзень, 23 чэрвеня, вайна накрыла Мінск смерцю і разбурэннямі, якія неслі варожыя авіяналёты. У гэты дзень Мікола Лобан запісаў наступнае: «Дзень пачаўся сігналам ВТ[2]. Мы саскочылі з коек і хутка апрануліся. Праз некалькі хвілін пачуліся стрэлы зенітак. Мы выбеглі да расчыненага акна. Скрозь шэрань росвітку відны былі ўспышкі шэрага дыму...

У гадзіны 2 дня назіралі за паветраным боем над аэрадромам. Пачуліся званкі пажарных. У баку аэрадрома стаяў дым...

Агню не было відна, толькі вялікі дым стаяў лявей аэрадрома. Прыйшлося вярнуцца. Прыехаўшыя цягніком расказалі, што гараць Асіповічы, Слуцк і Пухавічы.

На Савецкай[3] вялікі аўтамабільны рух. У аўтобусах і грузавіках праязджалі бежанцы, з чамаданамі і клумкамі. Да нас у пад'езд таксама пад'ехала машына з бежанцамі. Яны расказвалі пра жудасныя бамбардзіроўкі Гродна. Разнесліся чуткі, што немцы ўшчэнт зруйнавалі Брэст і Гродна, разбамбілі Беласток і Вільнюс...»

На наступны дзень, 24 чэрвеня, інтэнсіўнасць бамбёжак павялічылася, у дзённіку адзначана наступнае: «А палове дзясятай я і Шкраба сабраліся ісці ў бібліятэку, каб здаць кніжкі. Мы не дайшлі і да вугла, як пачулі стрэлы зенітак. З-пад Маскоўскай вуліцы ўсталі самалёты. Кругом іх рваліся баранкі зенітных узрываў. Чутно было, як свісцяць асколкі. Упарадзе прагучаў узрыў і падняўся слуп чорнага дыму. Самалёты прайшлі над намі. Калі самалёты зніклі, па вуліцы беглі людзі з клумкамі, з дзецьмі на руках. Ля нас спынілася фурманка. На дошкі былі накіданы падушкі, клумкі, пасярэдзіне сядзела маладая жанчына і крычала: «Гарыць фабрыка «Акцябр», узарваны Заходні мост, гарыць Маскоўская вуліца!»

Германскія бамбавікі над Мінскам у раёне ўніверсітэцкага гарадка 24-26 чэрвеня 1941 (у 1940 годзе адзін з карпусоў БДУ быў перададзены штабу БВА)

Палаюць дамы па вуліцы Бабруйскай. Выгляд з даху ўніверсітэцкага корпуса

Хадзілі са Шкрабам ва ўніверсітэт. Па Камсамольскай, Савецкай. Рэвалюцыйнай, Інтэрнацыянальнай, Свярдлоўскай бамбавыя варонкі, вывернутыя рэйкі ў некалькіх месцах, скрозь па тратуарах бітае шкло.

Разнесліся слухі пра падазроных асоб. Стоячы ў чарзе па хлеб, жанчына расказвала, што бачыла, як атрад чырвонаармейцаў абкружыў групу вайскоўцаў, сярод якіх былі жанчыны, і загадалі падняць рукі ўгару. Група вайскоўцаў была абяззброена. Студэнт расказваў, што быццам ва ўніверсітэцкім бомбасховішчы таксама затрымалі падазронага. Па Савецкай вялі падазронага ў рваным кажусе.

Бамбардзіроўкі былі настолькі частыя, што працягваліся праз кожныя 3-10 хвілін. К вечару інтэрнат апусцеў. Засталося толькі некалькі чалавек».

Як бачна, ужо на трэці дзень вайны горад напоўнілі бежанцы, паўсюль былі пажары і разбурэнні, а галоўнае – людзі не ведалі, што рабіць, горад напаўнялі супярэчлівыя чуткі. Спрабуючы разабрацца ў сітуацыі, студэнты накіроўваліся ва ўніверсітэт. Так, 25 чэрвеня Мікола Лобан адзначыў у дзённіку: «Ва ўніверсітэцкім гарадку я спаткаў двух мужчын, адзін з іх быў рэктар універсітэта Парфён Пятровіч Савіцкі.

– Што чуваць? – запытаў Савіцкі.

Я паказаў на пажар горада.

– Што на Нямізе?

Пакуль што цэлы. Фрунзенскі інтэрнат згарэў.

Савіцкі паказаў мне бомбасховішча. Я пастукаў, і мне адчынілі ўваход у двор. На двары стаяла група студэнтаў. Некаторыя з іх былі ўзброены малакаліберкамі. Сярод іх была Ніна Казлоўская. Як я рад быў спаткацца з ёю. Я запытаў, куды накіроўваецца гэты атрад на чале са Шнеерсонам. Мне адказалі, што пойдуць лавіць парашутыстаў. Я здзіўлена пазіраў на іх. На парашутыстаў? З малакаліберкамі? Супраць аўтаматычнай зброі?

Аднак я быў рад прыстаць хоць да такога атраду. Я пабег знайсці Шкрабу, каб пакінуць каля яго свае рэчы і ісці з атрадам. Шкрабу не знайшоў, і, калі выбег на двор, атрада ўжо не было. Я запытаўся, у якім напрамку адышоў атрад. Мне няўпэўнена паказалі на Ляхаўку. Мне не хацелася расставацца з Нінай, у якой цераз плячо быў надзеты процівагаз і санітарная сумка. Гэтым часам падышоў Вальштэйн, і мы пайшлі ў бок Магілёўскай шашы ў спадзяванні нагнаць атрад. Нідзе нікога не было, вуліцы былі пустыя, і толькі сяды-тады праязджалі на машынах раз'езды і спяшаліся запозненыя прахожыя. Было гадзін пяць раніцы. Мы ішлі далей. Па дарозе пападаліся варонкі ад выбухаў бомбаў. Ля адной з іх, якраз супраць завода «Бальшавік», ляжаў забіты мужчына, нейкі ўвесь сіні, і тварам, і вопраткай. Гэта, бадай, першая ахвяра вайны, якую я ўбачыў. На пераездзе чыгункі стаяў патрульны. Мы выйшлі за межы горада. Пакуль што было спакойна, і мы маглі працягваць сваю дарогу. Па дарозе спаткалі студэнтаў. Ніхто нічога не ведаў, што трэба рабіць. Я вырашыў ісці ў Матарова, дзе была сям'я Івана Бранаўца, майго сябра. Я разлічваў, што я перабуду дзён колькі ў Матарове, пакуль што-небудзь праясніцца. Астатнія таварышы, што былі са мною, вярнуліся ў Мінск...»

На наступны дзень Мікола Лобан вырашыў ісці на прызыўны пункт, для гэтага яму прыйшлося разам з таварышамі пехатой прайсці больш за 300 кіламетраў да горада Клімавічы, дзе ён і быў нарэшце прызваны ў армію. 27 верасня 1941 г. у баях на Волхаўскім фронце Мікола Лобан быў цяжка паранены асколкам гранаты ў шыйны пазванок, а праз тыдзень – у санітарны эшалон, на якім тэрмінова эвакуявалі шпіталь, трапіла бомба, яму раструшчыла косці абедзвюх ног. Ён адзіны з усяго вагона, хто цудам выжыў. Пасля доўгага лячэння ў шпіталях Кірава і Іркуцка Мікола Лобан быў камісаваны і накіраваны на працу настаўнікам у Казахстан. Восенню 1943 г. яго адзываюць у БДУ, які аднавіў сваю працу пад Масквой на станцыі Сходня. У 1945 г. Мікола Лобан нарэшце дачакаўся Перамогі і скончыў універсітэт.

У пасляваенныя гады Мікалай Паўлавіч займаўся навуковай і літаратурнай дзейнасцю. Многія з занатаваных у дзённіках падзей ляглі ў сюжэтныя лініі яго твораў, а людзі, якіх ён сустрэў на вайне, склалі непаўторныя вобразы персанажаў.

Уладзімір КУЛАЖАНКА,
дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ

Фота з фонду музея гісторыі БДУ

[1] Вальштэйн – студэнт фізмата, сусед М. Лобана па пакоі ў інтэрнаце па вул. Няміга, 21

[2] ВТ – паветраная трывога (воздушная тревога)

[3] Пр. Незалежнасці

ВЫДАТНЫЯ ІМЁНЫ БДУ

Прамоўца за навуку

Прапануем інтэрв'ю са славутым прадстаўніком юрыдычнай навукі БДУ **Юрыем СМІРНОВЫМ** – шматгадовым дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, памочнікам легендарнага П. М. Машэрава, загадчыкам аддзела навукі і навучальных установ ЦК КПБ, які да таго ж стаў першым у гісторыі юрыдычнага факультэта БДУ кандыдатам навук па працоўным праве.

– Юрый Пятровіч, як Вы трапілі ў Мінск па юрыдычную адукацыю?

– Улетку 1947 г. паступіў на гістарычны факультэт Ленінградскага ўніверсітэта, але вучыцца не атрымалася, бо не далі інтэрнат, а бацькі не маглі мяне ўтрымліваць. Пасля вяртання дахаты ўспомніў, як камсамольскім сакратаром арганізоўваў па даручэнні райкама партыі ў школе сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Савета СССР ад Валагодскай вобласці Генеральным пракурорам СССР К. П. Гаршэніным. Напісаў Канстанціну Паўлавічу ў Маскву з просьбай дапамагчы з набыццём прафесіі і наступнай працы. На вялікае здзіўленне, адказ паступіў досыць хутка, прычым быў дадзены з асабістым подпісам і гербавай пячаткай.

– Цікава, што там было?

– Гаршэнін напісаў, каб я забіраў дакументы пра паступленне на гістфак ЛДУ і ехаў на вучобу ў толькі што адноўлены юрыдычны інстытут у Мінску, куды патэлефанаваў і даў неабходныя даручэнні. Там жа заяўлялася ўпэўненасць у тым, што з годнасцю буду несці высокае званне юрыста.

– Ахарактарызуйце Г. А. Павецьева як чалавека і кіраўніка Мінскага юрыдычнага інстытута і навукі БДУ, якога Вы добра ведалі па грамадскай дзейнасці.

Ю. П. СМІРНОЎ – адзіны з юрыстаў, хто ўдастоены двух ордэноў Працоўнага Чырвонага Сцяга і ордэна Дружбы народаў. Гэтымі ўзнагародамі падкрэслены асабісты ўклад у давядзенне беларускага інтэлектуальнага патэнцыялу да найвышэйшага ўзроўню, што прызнавалася ва ўсім Савецкім Саюзе.

– Па асабістых якасцях Гаўрыіл Аляксеевіч быў валявы, паслядоўны, рашучы і разумны. Хоць яму напачатку сумеснай працы не было і 40, але жыццёвы досвед назапасіў немалы і разнастайны: дзетдомавец, парабкаваў, вучоба, аспірантура і праца ў Ленінградскім юрыдычным інстытуце, пракурорства ў Туркменіі, служба ў Ваенным трыбунале войскаў аховы тылу Ленінградскай вобласці і Народным камісарыяце юстыцыі СССР у вайну. Павецьеў кантактаваў з людзьмі, добра іх разумеў, умеў абраць талковых «паплечнікаў», адчуваў і падтрымліваў адораных. Пра мяне перад абраннем сакратаром камсамольскай арганізацыі інстытута ён казаў: «Гэта – наш чалавек!» Таму і падтрымаў тады і потым, пры выбарах кіраўніка партыйнай арганізацыі, і далей. Спрэчак «да хрыпаты» ў нас ніколі не было. Хутка знаходзілі паразуменне.

– Некаторыя даследчыкі лічаць няправільным вылучаць якую-небудзь школу ў якасці пераважнай падчас аднаўлення навукі права ў Беларусі. Маё ж меркаванне іншае: такая школа ёсць – ленінградская. А якая Ваша пазіцыя?

– Перш за ўсё адзначу, што ў ЦК КПБ Белдзяржуніверсітэту надавалася павышаная ўвага ў параўнанні з Акадэміяй навук, бо ён меў вялікую сувязь з праваахоўнымі, судовымі і гаспадарчымі органамі і арганізацыямі, куды накіроўваліся для працы выпускнікі. Дык вось, у МЮІ, а затым у БДУ, вядучыя кіраўнічыя пасады займалі галоўным чынам выхаванцы горада на Няве. У першую чаргу гэта сам Павецьеў, які скончыў Ленінградскі інстытут савецкага права ў 1933 г. і спачатку ўзначальваў 9 гадоў МЮІ, а затым 8 гадоў «усю навуку» БДУ ў якасці прарэктара.

Плячом у плячо з ім ішоў Уладзімір Аляксандравіч Дарогін, блізкі сябар і «аднакашнік», які быў намеснікам дырэктара МЮІ па навуцы і навучальнай працы, а пасля гэтага 5 гадоў – дэканам юрыдычнага факультэта БДУ.

Адначасова яны кожны па два дзясяткі гадоў загадвалі дзвюма вядучымі кафедрамі: Павецьеў – грамадзянскага права і працэсу, а Дарогін – тэорыі і гісторыі дзяржавы і права.

Яшчэ на дзвюх кафедрах – крымінальнага права і працэсу і крыміналістыкі – працяглы час выкладалі ў якасці дацэнтаў і прафесараў «ленінградцы»: І. І. Гарэлік, А. В. Дулаў; В. А. Шкурко, В. М. Шпілеў. Той жа Дулаў загадваў 18 гадоў кафедрай крыміналістыкі, а Шкурко на працягу сямі гадоў кіраваў юрыдычным факультэтам БДУ. Менавіта пад уплывам пералічаных асоб з'явілася плеяда беларускіх навукоўцаў-прававедаў, якія сталі дактарамі юрыдычных навук і вызначылі выгляд сённяшняй юрыспрундэнцыі: С. Р. Вікараў, С. Р. Драбязка, І. І. Марцінковіч, І. І. Цішкевіч, В. Ф. Чыгір, М. Р. Юркевіч і інш.

– Вам выпала амаль чвэрць стагоддзя працаваць у ЦК Кампартыі Беларусі і на працягу 6 гадоў дапамагаць першаму сакратару Пятру Машэраву…

– Так. Сапраўдны кіраўнік, якога любіў. Паважлівы быў і меў вельмі вялікае разуменне беларускага народа. Вельмі прынцыповы, не баяўся спрачацца нават з вышэйшым кіраўніцтвам з ЦК КПСС. Дарэчы, і там карыстаўся немалым аўтарытэтам.

У інтэрв'ю «Ці ўзышлі азімыя?» у часопісе «Ветразь» (1989, № 10) я прыгадваў думкі і справы «шэфа» пра тое, што:

нам патрэбныя не «танныя», а культурныя, развітыя і добра адукаваныя працаўнікі;

выратаванне нашай дзяржавы ў інтэнсіўнай працы на будучыню;

ураўнілаўка згубная;

неабходна стварэнне школ і сістэмы падбору таленавітых людзей, здольных выгадаваць і павесці за сабой сапраўдную навуковую інтэлігенцыю;

павінны быць маральныя праграмы, якіх неабходна трымацца і ў сферы гаспадарчай, і ў кадравай палітыцы, і ў сістэме навучання, і ў асабістых адносінах.

– Ці былі падчас замежных паездак прамыя ці ўскосныя звязкі з працоўным правам?

– Пётр Міронавіч нярэдка ўключаў мяне ў склад дэлегацый для ўдзелу ў розных міжнародных форумах. Аднойчы ў Парыжы запрасілі на фабрыку, дзе кіраваў сябар Камуністычнай партыі Францыі. Уразіла, што падчас праходжання па цэхах ніводны з працоўных нават не падняў галавы. Машэраў сказаў: «Глядзі, юрыст, якое стаўленне да працы і дысцыпліны. А ў нас бы пакідалі працу і арганізавалі гаварыльню-мітынг з нагоды прыходу важнага госця».

– Па Вашай агульнай з жонкай Кларай Міхайлаўнай улюбёнасці ў літаратуру непазбежныя былі сустрэчы з вядомымі беларускімі пісьменнікамі і паэтамі. Каго хацелі б вылучыць?

– Па выдавецкай працы Клара блізка сышлася з жонкай Ніла Гілевіча Нінай Іванаўнай, і мы дужа сябравалі сем'ямі больш за 40 гадоў: амаль заўсёды адзначалі дні нараджэння, розныя святы, размаўлялі і інш.

Публікаваў нават успаміны пра тое, як П. М. Машэраў асабіста прыняў удзел у «справе» Ніла, на якога, тады яшчэ маладога літаратара, навесілі цэтлік нацыяналіста. Пётр Міронавіч з маёй падачы сам узяўся чытаць Гілевіча, і яго меркаванне сыграла самую станоўчую ролю ў творчым лёсе пісьменніка.

– Давайце закранём тэму стварэння Працоўнага кодэкса ў 1991–1999 гг.

– Памятаю велізарнае напружанне. На першых этапах асноўную ролю ад Федэрацыі прафсаюзаў іграў загадчык аддзела па заканадаўчай ініцыятыве і прававых пытаннях Барыс Аляксеевіч Волкаў. Пасля яго пытаннямі кадыфікацыі прыйшлося займацца мне, калі даручылі ўзначаліць юрыдычны аддзел ФПБ. Адзначу, у прыватнасці, што ў праекце Працоўнага кодэкса апынулася адлюстраванай большасць з двухсот прапаноў ад федэрацыі.

– На што хацелі б зарыентаваць будучыя пакаленні студэнтаў, выкладчыкаў і навукоўцаў?

– Галоўнае з пажаданняў – быць высокаманальнымі, працаваць «у поце твару свайго», увесь час удасканальвацца і імкнуцца да спазнання Праўды, не грэбуючы зробленым папярэднікамі. Менавіта такі шлях прывядзе да сур'ёзных творчых здзяйсненняў.

Віктар КРЫВОЙ,
доктар юрыдычных навук

**Поўны тэкст апублікаваны на сайце газеты www.gazeta.bsu.by*

ВІНШУЕМ!

Вучоны з сусветнай вядомасцю

1 ліпеня споўнілася 75 гадоў выбітнаму навукоўцу-фізіку **Уладзіміру БАРЫШЭЎСКАМУ,** заслужанаму дзеячу навукі Беларусі, лаўрэату Дзяржаўнай прэміі.

Яго жыццёвы шлях можа служыць прыкладам для маладых людзей, якія пачынаюць сваю навуковую дзейнасць. У. Р. Барышэўскі скончыў фізічны факультэт БДУ ў 1962 г. Вучыўся ў аспірантуры Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў у г. Дубна. У 1965 г. абараніў у БДУ кандыдацкую дысертацыю. У 1974 г. атрымаў ступень доктара фізіка-матэматычных навук (МІФІ). У. Р. Барышэўскі працаваў асістэнтам, старшым выкладчыкам, старшым навуковым супрацоўнікам, дацэнтам, прафесарам кафедры ядзернай фізікі БДУ (1965–1986). У 1986–2012 гг. ён – арганізатар і першы дырэктар Навукова-даследчага інстытута ядзерных праблем. Цяпер – галоўны навуковы супрацоўнік і Ганаровы дырэктар НДІ ЯП БДУ.

Уладзімір Барышэўскі – аўтар двух навуковых адкрыццяў:

– «З'ява ядзернай прэцэсіі нейтронаў» (Аўтары: У. Р. Барышэўскі, М. І. Падгарэцкі. Прыярытэт № 224 ад 3 красавіка 1964 г.)

– «З'ява кручэння плоскасці палярызацыі жорсткіх гама-квантаў» (Аўтары: Барышэўскі У. Р., Лабашоў В. М., Любошыц В. Л., Сераброў А. П., Сматрыцкі Л. М. Дыплом выдадзены 21 чэрвеня 1991 г.)

У. Р. Барышэўскі займаецца даследаваннямі, звязанымі з распрацоўкай аб'ёмных лазераў на свабодных электронах, ядзернай оптыкай палярызаваных асяроддзяў, электрамагнітнымі працэсамі ў крышталях пры высокіх энергіях, выбуховамагнітнай кумуляцыяй энергіі, эфектамі парушэнняў Р– і Т-інварыянтнай. Аўтар больш за 200 публікацый. Ён з'яўляецца стваральнікам новага прызнанага ў свеце напрамку – аб'ёмных лазераў на свабодных электронах (АЛСЭ), заснавальнікам і кіраўніком навуковай школы «Ядзерная оптыка палярызаваных асяроддзяў».

За сваю навуковую дзейнасць У. Р. Барышэўскі быў ушанаваны дзяржаўнымі ўзнагародамі і званнямі: Ордэн «Знак Пашаны» (1981), заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь (1996), Ордэн Францыска Скарыны (2001), лаўрэат Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі (2002) за цыкл прац «Квантавая электрадынаміка і кагерэнтныя ядзерныя працэсы ў асяроддзі: квантавая і ядзерная оптыка» (сум. з Бераставым А. В., Кіліным С. Я., Рудаком Э. А., Ціхаміравым В. В., Феранчуком І. Д.), заслужаны работнік БДУ (2010).

Віншуем Уладзіміра Рыгоравіча з юбілеем і жадаем творчых поспехаў і плённай дзейнасці на карысць універсітэта, Інстытута ядзерных праблем і ўсёй навукі!

НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

01 ліпеня Каваленка Анатоль Уладзіміравіч, дацэнт кафедры тэарэтычнай і істытуцыянальнай эканомікі

05 ліпеня Каўшэвіч Таццяна Уладзіміраўна, начальнік Галоўнага ўпраўлення бухгалтарскага ўліку і фінансаў

06 ліпеня Шасцярнёва Лілія Георгіеўна, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання

09 ліпеня Самахвалаў Дзмітрый Сяргеевіч, дацэнт кафедры крыніцазнаўства

12 ліпеня Меленец Юрый Вітальевіч, дацэнт кафедры тэорыі імавернасцяў і матэматычнай статыстыкі

21 ліпеня Мелех Ала Уладзіміраўна, дырэктар студэнцкага гарадка

24 ліпеня Трухан Алена Антонаўна, дацэнт кафедры псіхалогіі

26 ліпеня Турышаў Леанід Мікалаевіч, дырэктар установы БДУ «Нацыянальны навукова-даследчы цэнтр маніторынгу азонасферы»

28 ліпеня Арлова Таццяна Дзмітрыеўна, прафесар кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі

29 ліпеня Ляховіч-Петракова Наталля Віктараўна, дацэнт кафедры паліталогіі

БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

Візіт прэзідэнта Індыі ў БДУ – БелаПАН (02.06), mail.ru, naviny.by, АТН (БТ-1), Мінск 24-ДОК, АНТ, СТБ, БелТА, 21.by, nv-online.info/by, megacat.by (03.06), Tut.by (05.06), «Настаўніцкая газета» (06.06), nastgaz.by (08.06).

Пра правядзенне ў БДУ Міжнароднага летняга ўніверсітэта юрыстаў – megacat.by (01.06), БелаПАН (02.06), БелТА, радыё «Сталіца» (23.06).

У БДУ распрацавана новае інтэлектуальнае пасведчанне супрацоўніка – БелТА, Interfax.by, megacat.by (01.06.), «Савецкая Беларусь», sb.by, радыё «Сталіца», naviny.by, БелаПАН, tvr.by (БТ-1) (04.06), АНТ (05.06), «Звязда», zviazda.by (06.06), kv.by (08.06), park.by (09.06).

Пра летнюю школу журналістыкі ў БДУ – megacat.by, hand-embroidered10.rssing.com (07.06), tvr.by (БТ-1), souzveche.ru (09.06), АНТ, «Звязда» (10.06).

Адкрыццё філіяла кафедры эканомікі і кіравання бізнесам ДІКСТ БДУ на базе Саюза юрыдычных асоб – megacat.by (09.06), ecopress.by, rce.by (11.06).

Студэнцкія атрады Штаба працоўных спраў БРСМ БДУ – megacat.by (07.06), Interfax.by (08.06), СТБ, Звязда», zviazda.by (09.06), edu.gov.by (11.06).

Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ

ВЕДАЙ НАШЫХ!

Узнагароды еўрапейскіх гульняў

Алена Амялюсік

Студэнты БДУ заваявалі залаты і два бронзавыя медалі на Еўрапейскіх гульнях у Баку і тым самым зрабілі важкі ўнёсак у скарбонку нацыянальнай зборнай.

Першакурсніца юрыдычнага факультэта Алена Амялюсік стала «залатым» прызёрам у жаночай групавой велагонцы. Дыстанцыю працягласцю 120,7 км новаспечаная чэмпіёнка пераадолела за 3 гадзіны 20 мін. 36 сек. Другой да фінішу з такім жа часам прыйшла полька Каташына Невядома, а трэцяе месца ў Ганны ван дэр Брэген з Нідэрландаў. Алена Амялюсік вырвала перамогу на апошніх сантыметрах дыстанцыі. Яшчэ дзве беларускі Вольга Антонава і Таццяна Шаракова фінішавалі ў другой групе з вынікам 3 гадзіны 25 мін. 53 сек.

Таксама на рахунку студэнтаў БДУ два бронзавыя медалі па грэка-рымскай барацьбе, заваяваныя

Віктар Сасуноўскі



Іосіф Чугашвілі

прадстаўнікамі юрыдычнага факультэта пяцікурснікам Віктарам Сасуноўскім і першакурснікам Іосіфам Чугашвілі.

Падчас турніру ў катэгорыі да 80 кг Віктар Сасуноўскі быў мацнейшы за грузіна Лашы Габадзэ, наступным зрынутым супернікам стаў немец Фларыян Ноймаер. У 1/2 фіналу беларус не змог выйграць у расіяніна Яўгена Салеева, будучага чэмпіёна, і правёў паядынак за бронзавы медаль. У суцяшальным паядынку ён апынуўся мацнейшым за ўкраінца Аляксандра Шышмана. Паядынак за бронзу беларус правёў з відавочнай перавагай. Віктар Сасуноўскі ўжо на старце зарабіў два балы за выкананы накат, а затым яму ўдаўся яшчэ адзін прыём, які практычна забяспечыў яму перамогу.

Першакурснік юрфака Іосіф Чугашвілі заваяваў бронзу ў вагавай катэгорыі 130 кг. Падчас турніру ён перамог грэка Аляксандраса Пападатаса, у чвэрцьфінале – вядомага нямецкага атлета Эдуарда Попа, але ў паўфінале саступіў азербайджанцу Сабахі Шарыяці. У паядынку за бронзавую ўзнагароду Іосіф Чугашвілі сустрэўся з грузінскім атлетам Якабі Каджая і змог правесці вырашальны накат, які дазволіў яму перамагчы.

Трэнерам студэнтаў БДУ выступае старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту ВНУ Мікалай Прусаў.

Усяго ў склад беларускай зборнай увайшлі чатыры прадстаўнікі БДУ, сярод якіх яшчэ адзін студэнт юрыдычнага факультэта чацвёртакурснік Джавід Гамзатаў (грэка-рымская барацьба).

Аліна ДАШКЕВІЧ

БДУ аб'яўляе прыём ў аспірантуру і дактарантуру

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру, павінны мець: вышэйшую адукацыю; схільнасць да навуковых даследаванняў, рэкамендацыю савета факультэта (для тых, хто паступае ў год заканчэння навучання) або досвед практычнай працы не менш за два гады на пасадах, што патрабуюць наяўнасці вышэйшай адукацыі; для тых хто паступае на дзённую ці завочную форму навучання: здадзеныя кандыдацкія іспыты (замежная мова, філасофія і метадалогія навукі) і залік (асновы інфармацыйных тэхналогій) да паступлення ў аспірантуру.

Для тых, хто паступае ў аспірантуру для навучання ў завочнай форме атрымання адукацыі і ў форме суіскальніцтва, досвед практычнай працы не менш за два гады на пасадах, якія патрабуюць наяўнасці вышэйшай адукацыі, з'яўляецца абавязковым.

Для атрымання пасляўніверсітэцкай адукацыі I ступені па спецыяльнасцях педагагічнай галіны навукі прымаюцца асобы, якія маюць вышэйшую педагагічную адукацыю і стаж працы ў сферы адукацыі ў якасці спецыяліста з вышэйшай адукацыяй не менш за два гады.

Дапускаецца паступленне ў аспірантуру асоб, спецыяльнасць (спецыялізацыя) вышэйшай адукацыі якіх не адпавядае галіне навукі, па спецыяльнасці якой плануецца іх навучанне ў аспірантуры. Падчас навучання дадзеныя асобы павінны таксама здаць іспыт у аб'ёме агульнаадукацыйнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці (спецыялізацыі), якая супадае са спецыяльнасцю ў аспірантуры ці блізкай да яе.

Навучанне ў аспірантуры БДУ ажыццяўляецца як за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту, так і на платнай аснове.

Асобы, якія паступаюць у аспірантуру і дактарантуру, падаюць на імя рэктара заяву, да якой прыкладаюць дакументы ў адпаведнасці з пералікам, вызначаным Міністэрствам адукацыі. Дакумент, які сведчыць асобу, і арыгіналы дакументаў пра адукацыю прад'яўляюцца пры паступленні ў аспірантуру асабіста.

Падрабязная інфармацыя па правілах прыёму, у т. л. план прыёму і пералік дакументаў на сайце БДУ **(http://www.bsu.by / Адукацыя/ Аспірантура і дактарантура/ Тым, хто паступае ў аспірантуру)** ці па тэлефоне: 209-51-73, 209-50-24.

Прыём дакументаў ажыццяўляецца з 1 жніўня па 30 верасня 2015 года па адрасе: г. Мінск, вул. Бабруйская, 9, каб. 414, аддзел аспірантуры і дактарантуры.

СТУДЭНЦКІ ІНТАРЭС

Санаторыю-прафілакторыю быць!

4 чэрвеня адбылася сустрэча-нарада прадстаўнікоў студэнцкага прафкама і адміністрацыі санаторыя-прафілакторыя БДУ з удзелам прарэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Уладзіміра Суворава. На ёй была абмеркавана праца дадзенай установы і вызначаны кірункі яе дзейнасці.



Санаторый-прафілакторый на сустрэчы прадстаўлялі галоўны ўрач Дзяругіна Вольга Аляксандраўна, урач-тэрапеўт Шорах Алена Уладзіміраўна і галоўная медсястра Шкурдзэ Тамара Аляксандраўна.

Праца санаторыя памянялася з пераездам. Да мінулага года санаторый-прафілакторый размяшчаўся ў інтэрнаце БДУ № 3 (вул. Курчатава, 6), у сувязі з неабходнасцю правядзення капітальнага рамонту інтэрната санаторый быў пераведзены на базу інтэрната БДУ № 11 (вул. Дзяржынскага, 87) і інтэрната № 4 (вул. Чурлёніса, 7). Санаторыю атрымалася правесці неабходнае ліцэнзаванне, а праз год будзе праходзіць акрэдытацыя ўстановы, таму меркаванне студэнтаў, а таксама прапановы па працы санаторыя вельмі важныя.

Сустрэча пачалася з апісання бягучага стану санаторыя-прафілакторыя: на сёння перад ім стаіць праблема недабору кліентуры. Нягледзячы на пэўную сезоннасць (мінімальная наведвальнасць санаторыя-прафілакторыя выпадае на перыяд сесіі), агульная колькасць ахвотных паправіць здароўе зменшылася. Персанал санаторыя скараціўся да мінімуму – у санаторыі працуюць 7 чалавек, уключаючы ўрача, санітарку, медсясцёр, інструктара ЛФК і загадчыка гаспадаркі. Супрацоўнікі імкнуцца не ўжываць хімічных сродкаў, лекаў (толькі ў экстранных выпадках), гарантуюць індывідуальны падыход да студэнта, на базе паказанняў, з якімі быў накіраваны студэнт на аздараўленне, складаецца праграма і даюцца рэкамендацыі з улікам спецыфікі захворвання. У планах працы санаторыя-прафілакторыя абсталяванне водалячэбніцы, бо расце колькасць захворванняў вегетатыўнай нервовай сістэмы – аптымальным рашэннем з'яўляецца водалячэнне. Перавага працы санаторыя-прафілакторыя – выдача талонаў на харчаванне, каб студэнт меў магчымасць паўнавартасна харчавацца. Рэалізацыя талонаў магчымая ў сталовых БДУ, спіс якіх увесь час папаўняецца.

Працай санаторыя-прафілакторыя студэнты задаволены, аднак ёсць і шэраг праблем. На сустрэчы шляхам сумеснага дыялогу абмеркавалі незадаволенасць студэнтаў графікам працы санаторыя, бо часам ва ўніверсітэце затрымліваешся дапазна і проста не паспяваеш наведаць працэдуры. Яшчэ паўстаў шэраг пытанняў пра магчымасць рэалізацыі талонаў на харчаванне не «дзень у дзень». Бо зноў жа, бываюць дні, калі няма магчымасці наведаць сталовую, а губляць грошы студэнтам не хочацца. Была разгледжана і праблема недастатковай інфарматыўнасці пра працу санаторыя-прафілакторыя, падчас якой было прынята рашэнне пра аказанне інфармацыйнай падтрымкі дзейнасці санаторыя-прафілакторыя з боку прафкама студэнтаў БДУ.

Задаваліся пытанні і пра магчымасць наведвання санаторыя замежнымі студэнтамі. Актывістам растлумачылі, што магчымасць аздараўлення замежных студэнтаў у санаторыі-прафілакторыі БДУ маецца, аднак за поўны кошт і без талонаў на харчаванне.

На ўсе пытанні былі дадзены падрабязныя растлумачэнні, і рэкамендацыі студэнтаў былі прыняты да ўвагі. У выніку сустрэчы было вынесена рашэнне пра захаванне санаторыя-прафілакторыя БДУ, бо гэта ўнікальная магчымасць для студэнтаў разоў у год умацаваць сваё здароўе па даступным кошце.

Ганна ХАЦЯНОВІЧ
Фота Кацярына РУДКОЎСКАЯ

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

2 ліпеня 2015 года
Падпісана да друку 30.06.2015 г.
Зак. ___. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана ў РУП «Выдавецкі цэнтр БДУ»
ЛП № 02330/117 ад 14.04.2014.
220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6

Рэдактар Сяргей Сяргеевіч ШАФАЛОВІЧ
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, прасп. Незалежнасці, 4
Прыёмная: вул. Кальварыйская, 9, каб. 102, тэл. 259-70-77,
e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by